# ВАКАЛЬНАЯ СПАДЧЫНА АЛЕГА ЧЫРКУНА



Алег Чыркун – беларускі кампазітар, грамадскі дзеяч, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, уладальнік медаля Францыска Скарыны і нагруднага знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», член грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кампазітараў» з 1980 г., старшыня ваенна-шэфскай камісіі БСК, лаўрэат прэміі Міністра абароны Рэспублікі Беларусь.

Нарадзіўся будучы кампазітар 10 лютага 1942 г. у акупаваным фашыстамі Мінску. Сям'я была беднай, маці пасля вайны часта хварэла, па некалькі год запар магла знаходзіцца ў шпіталі, таму маленькі Алег быў вымушаны выхоўвацца ў дзіцячым доме. Там ён у адным з куткоў установы знайшоў музычныя інструменты: баян, акардэон, гармонік, балалайку, мандаліну, фартэпіяна і паступова, самастойна, як кажуць «на слых», навучыўся на іх іграць. Калі яму было 10 год, маці купіла сыну гармонік, так званую звычайную «двухрадку» і цераз нейкі час будучы кампазітар таксама ўжо граў на ім. Неўзабаве малы Алег нават змог замяніць баяніста, які суправаджаў сваім выкананнем музычныя танцавальныя вечары ў дзетдоме, калі той выпусціўся з установы і пайшоў вучыцца далей. Былі ў будучага кампазітара і вялікія пеўчыя здольнасці, якія ён атрымаў ад маці. Дзякуючы свайму прыгожаму голасу, Алега нават запрасілі на Беларускае тэлебачанне, дзе ён у эфіры праспяваў песні «Орленок» і «Санта Лючия». Да гэтага часу адносяцца яго першыя спробы напісання самастойных музычных твораў.

Калі хлопчыку споўнілася 15 год, ён пачаў вучыцца на будаўніка-муляра. Такі выбар быў зроблены таму, што «Там кармілі і форму давалі». Пасля вучобы ён працаваў на заводзе слесарам, але пра музыку не забываў, актыўна ўдзельнічаў у творчай самадзейнасці. Шлях выканаўцы-аматара ўрэшце рэшт прывёў Алега Чыркуна ў 1962 г. у Мінскае музычнае вучылішча імя М. І. Глінкі на харавое аддзяленне, куды ён паступіў з першага раза, нават не меўшы за плячыма пачатковай музычнай школы. У вучылішчы факультатыўна Алег займаўся з Рычардам Пятровічам Бутвілоўскім, беларускім кампазітарам, вучнем Мікалая Аладава, які

раскрыў талент будучага аўтара знакамітых музычных твораў і песень. Пасля атрымання дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі малады музыка працаваў кіраўніком хору ў прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 52 г. Мінска.

Скончыўшы музычнае вучылішча, Алег Чыркун паступае ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю на кампазітарскае аддзяленне. Навучаецца ў такіх вядомых беларускіх кампазітараў, як Пётр Пятровіч Падкавыраў, Дзмітрый Браніслававіч Смольскі і Ігар Міхайлавіч Лучанок. Пасля заканчэння кансерваторыі малады кампазітар працуе спачатку ў Мінскім культасветвучылішчы, а потым на кафедры беларускай народна-песеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У 1980 г. Алег Чыркун быў прыняты ў Беларускі саюз кампазітараў.

Першыя буйныя творы, напісаныя яшчэ ў кансерваторыі і ў першыя гады пасля яе заканчэння, адносяцца да жанраў сімфанічнай, вакальна-інструментальнай і камерна-інструментальнай музыкі. Трохі пазней ён захопіцца працай над музычным афармленнем тэатральных пастановак, што і прывядзе яго да стварэння буйных сінтэтычных сцэнічных форм: аперэт і музычных казак. Музыка Алега Чыркуна традыцыйна па сваіх тэхнічных сродках выразнасці, якімі карыстаецца аўтар, што паказвае на яе сувязь з еўрапейскай класіка-рамантычнай стылістыкай, падкрэслівае дэмакратычнасць і даступнасць успрымання музычнага матэрыялу слухачамі. Спалучэнне выразнай маляўнічай гармоніі і рамансавых інтанацый, лірычнага пачатку фальклорных песенных мелодый і сучасных папулярных рытмаў надаюць творам кампазітара асаблівую выразнасць і арыгінальнасць.

Аднак жа галоўная сфера творчасці Алега Чыркуна – стварэнне песень. Вось як у адным з інтэрв'ю кампазітар гаворыць пра творчы працэс іх стварэння: «Калі пішу музыку, часцей за ўсё натхняюся вершамі. Калі б я мог сам пісаць вершы, ствараў бы вельмі добрыя песні. Аб чым думаю, калі пішу музыку? Аб каханні. У творчасці натхненне даюць менавіта жанчыны. Я з тых кампазітараў старой закваскі, у якіх у мелодыях яшчэ прысутнічае душа. Я лічу, што ў песні павінна быць мелодыя, а не проста набор нот, як гэта часта гучыць на сучаснай эстрадзе. Кампазітар сапраўдны – гэта даецца ад Бога. А як вызначыць, таленавіты ці проста рамеснік? Па меладызме. Пройдзе праз душу, тады і мелодыя. Але здольных меладыстаў вельмі мала».

Песні Алега Чыркуна працягваюць традыцыі такіх карыфеяў гэтага жанру ў беларускай музыцы, як Уладзімір Алоўнікаў, Юрый Семяняка, Ісак Любан, Нестар Сакалоўскі, Яўген Глебаў, Уладзімір Буднік. Ёсць у іх сардэчнасць і прастата, якія робяць вакальныя мініяцюры кампазітара лёгка ўспрымальнымі, запамінальнымі і папулярнымі. Аўтар знайшоў свой песенны стыль, які грунтуецца на спалучэнні шырока развіваючагася фальклорнага меласа з сучаснымі эстраднымі шлягернымі інтанацыямі. Такі арганічны сплаў дае магчымасць А. Чыркуну як мага шырэй раскрыць сэнс паэтычнай асновы песень, акунуцца ва ўнутраны свет вершаваных радкоў, каб потым дакладна падабраць жанравы выток, форму, сродкі музычнай выразнасці, эмацыянальную афарбоўку.

Змест песень кампазітара ахоплівае шырокае кола тэм і вобразаў: мяккія, любасныя любоўна-лірычныя, актыўныя і энэргічныя грамадзянскія, патрыятычныя, прысвечаныя Бацькаўшчыне і розным куточкам Беларусі ці яе славутым дзеячам, вясёлыя гумарыстычныя сцэнкі, неверагодны, яркі дзіцячы свет. Некаторыя вакальныя творы стылізаваны пад беларускія народныя песні і прызначаны для выканання выключна ў народнай манеры спеваў. Не чужыя аўтару і духоўныя матывы.

Песенная спадчына Алега Чыркуна карыстаецца вялікім попытам як сярод прафесійных, так і аматарскіх выканаўцаў. Творы кампазітара ў свае праграмы ўключалі Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча, Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь вакальна-інструментальны ансамбль «Сябры», Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята», Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Крупіцкія музыкі», народныя артысты Рэспублікі Беларусь Якаў Навуменка, Віктар Чарнабаеў, Уладзімір Правалінскі, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ганна Радзько, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Руслан Аляхно, салісты Вячаслаў Статкевіч, Ірына Раманоўская, Святлана Шыманская і інш.

У новым песенным зборніку Алега Чыркуна можна знайсці як вядомыя і любімыя творы («Сена маладое», «Нёманам зачарованая», «Прыязджайце да дому» і інш.) так і невядомыя кампазіцыі, якія друкуюцца ўпершыню («Два арлы», «Франтавым медыкам», «Акрылёныя небам» і інш.), якія прыйдуцца да спадобы ўсім карыстальнікам выдання. Нотны матэрыял перш за ўсё рэкамендаваны аматарам вакальнага мастацтва: спевакам-салістам, як з народнай, так і з акадэмічнай манерай спеву, кіраўнікам аматарскіх і прафесійных вакальных ансамбляў, эстрадных студый. Зборнік будзе цікавы выкладчыкам музычных школ і каледжаў мастацтваў, вышэйшых навучальных устаноў з творчай накіраванасцю і ўсім прыхільнікам песеннай творчасці кампазітара Алега Чыркуна.

*А. Ю. Валодчанка,*
*старшы выкладчык кафедры*
*народна-песеннай творчасці і фальклору*
*УА «БДУКМ», магістр мастацтваў*